УДК 629.735

## Беларусы ў ЗША

Лойка Т.В., Арбузаў А.Ц.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Беларуская прысутнасць у ЗША склалася ў выніку некалькіх хваль эміграцыі за акіян. Па падліках В. Кіпеля, аўтара кнігі "Беларусы ў ЗША", у 90-я гады тут пражывала каля 600 тыс. беларусаў першага, другога і трэцяга пакаленяў. Там, дзе яны пражываюць больш-менш кампактна ўзніклі беларускія асяродкі. У іх дзе ёсць свае цэрквы або касцёлы, крамы, касы ўзаемадапамогі, культурныя цэнтры з бібліятэкамі, школамі, музеямі. Найбольш вядомымі з'яўляюцца паселкі Саўт-Рывер у штаце Нью-Йорк, Су-Сіці у штаце Айова, "Полацак" у штаце Агайо і іншыя.

Імкненне да кансалідацыі і палітычнай актыўнасці здзяйснялася праз грамадскія арганізацыі, якіх у сярэдзіне XX ст. налічвалася некалькі дзесяткаў. Вядучую ролю сярод іх мела Беларуска-амерыканскае задзіночанне (БАЗА), якая функцыянуе і сёння БАЗА праводзіць пэўную работу па прапагандзе беларускіх нацыянальных традыцый, пашырае сувязі з суродзічамі ў іншых краінах свету.

Творчыя сілы эміграцыі групуюцца вакол створанага яшчэ у 1951 г. Беларускага інстытута навукі і мастацтва (БІНІМ). Тут займаюцца даследаваннем гісторыі і культуры, праводзяцца вечарыны, ладзяцца выставы. Галоўнай газетай беларускага замежжа з'яўляецца газета "Беларус", якая выходзіць у Нью-Йорку уже 60 гадоў. Рэгулярна выдаюцца і маюць свае сайты у Інтэрнэце інфармацыйны бюлетэнь Belarusian Review, часопіс "Беларускі час", "Беларускі дайджест".

Разам з тым апошнім часам назіраецца няўхільнае змяншэнне колькасці і спад палітычнай актыйнасці беларускага замежжа. Захаванне і перспектывы беларускай дыяспары ў ЗША залежаць перш за ўсе ад яе рэальнага ўзаемадзеяння з гістарычнай Радзімай, прытоку новых эмігрантаў, стварэнне спрыяльнага бізнэс-клімату для суайчыннікаў замежжа, а таксама рэалізацыі праекта БІНІМ і ЗБС "Бацькаўшчына" па стварэнню Энцыклапедыі беларускай дыяспары.

УДК 9 (476)

## Проект создания лицея в г. Орше в 1830-х гг.

Лелеш О.В.
Белорусский национальный технический университет

Восстание 1830-1831 гг. стало точкой отсчета новой программы преобразований российских властей в западном регионе Российской